4. ГАНИСО. Ф. 6. Оп. 1. Д. 1304.
5. ГАНИСО. Ф. 6. Оп. 65. Д. 133.
6. ГАНИСО. Ф. 1737. Оп. 1. Д. 41а.
7. ГАНИСО. Ф. 1737. Оп. 1. Д. 50.

## СЕКЦЫЯ 7.

## ЭТНАКУЛЬТУРНАЯ І АРХЕАЛАГІЧНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСІ

УДК 39 (476) «19/20»

# БЕЛАРУСКАЯ ЭТНАЛОГІЯ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX – ПАЧАТКУ XXI СТ. АБ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ

**І. Г. Бачыла**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь;* bochilka@yandex.ru

У артыкуле даследуецца гісторыя вывучэння традыцыйнай матэрыяльнай культуры Заходняга Палесся айчыннай этналогіяй у другой палове XX – пачатку XXI ст. Аўтарам прааналізаваны і сістэматызаваны працы па праблеме, вызначана ступень яе вывучанасці.

***Ключавыя словы:*** беларуская этналогія; гістарыяграфія; гістарычна-этнаграфічныя рэгіёны; матэрыяльная культура; Заходняе Палессе.

# БЕЛОРУССКАЯ ЭТНОЛОГИЯ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XX – НАЧАЛА XXI В. О МАТЕРИАЛЬНОЙ КУЛЬТУРЕ ЗАПАДНОГО ПОЛЕСЬЯ

**И. Г. Бочило**

*Белорусский государственный университет,*
*пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь;* bochilka@yandex.ru

В статье исследуется история изучения традиционной материальной культуры Западного Полесья отечественной этнологией во второй половине XX – начале XXI в. Автором проанализированны и систематизированны работы по проблеме, определена степень её изученности.

***Ключевые слова:*** белорусская этнология; историография; историко-этнографические регионы; материальная культура; Западное Полесье.

# BELARUSIAN ETHNOLOGY OF TRADITIONAL MATERIAL CULTURE OF THE WESTERN POLESYE OF THE SECOND HALF OF XX – THE BEGINNING OF XXI CENTURIES

**I.G. Bachyla**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, bochilka@yandex.ru*

The article is devoted to the history of the study of the traditional material culture of the Western Polesye by native ethnologists of 2nd half of XX – the beginning of XXI centuries. The author has analysed and systematized works concerning this problem. The degree of this investigation was characterized.

***Key words:*** belarusian ethnology; historiography; historical and ethnographic regions; material culture; Western Polesie.

Як гістарычна-этнаграфічны рэгіён Заходняе Палессе заўсёды выклікала асаблівую і непадробна жывую цікавасць з боку спецыялістаў у галіне этналогіі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ўвага да яго не стала меншай. Наадварот, заходнепалескі матэрыял актыўна назапашваўся і апрацоўваўся ў сувязі з вывучэннем шырокага спектра тэм, у першую чаргу, матэрыяльнай культуры. Так, вядомай даследчыцай Л. А. Малчанавай паводле асаблівасцяў матэрыяльнай культуры і геаграфіі распаўсюджвання яе элементаў у межах нашай краіны былі вылучаныя тры вобласці [6, с. 32]. Адна з іх – паўднёва-заходняя, – амаль цалкам супадае з межамі

Палесся. У кнізе Л. А. Малчанавай «Материальная культура белорусов» (1968) прадстаўлены фактычны матэрыял аб некаторых асаблівасцях палескага жылля, касцюма, традыцый харчавання, сельскагаспадарчых прылад працы, размешчаны карты, якія адлюстроўваюць распаўсюджванне асобных элементаў матэрыяльнай культуры ў межах краіны, праведзены параўнальны аналіз выкарыстання іх лакальных назваў.

У канцы 1960-х – пачатку 1970-х гг. навуковыя супрацоўнікі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР прымалі ўдзел у стварэнні рэгіянальнага гістарычна-этнаграфічнага атласа. Гэта была частка глабальнага навуковага праекта па стварэнні спецыяльных работ, якія ахоплівалі б усе вобласці традыцыйнай культуры народаў СССР. У межах працы над атласам беларускімі навукоўцамі вяліся даследаванні па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Выкарыстанне метадаў картаграфавання дазволіла вылучыць некалькі гістарычна-этнаграфічных раёнаў, зафіксаваць некаторыя асаблівасці жылля, прылад працы і касцюма беларусаў Палесся. Паказальнымі сталі прыведзеныя даследчыкамі прыклады мясцовых канструктыўных прыёмаў будаўніцтва, планіроўкі двароў і жылля, гаспадарчых пабудоў. Пэўная рэгіянальная разнастайнасць была зафіксавана і ў дачыненні да касцюма: «... беларускае адзенне ў XIX – пачатку XX ст., як паказвае картаграфаванне, не было аднародным на ўсёй беларускай тэрыторыі. Многімі асаблівасцямі касцюма выдзялецца вялікая тэрыторыя на паўднёвым захадзе – Палессе, раёны Падняпроўя з усходняй Віцебшчынай і тэрыторыя, якая ахоплівае сучасную заходнюю Віцебшчыну і поўнач Гродзеншчыны» [1, с. 94]. На падставе шэрагу асаблівасцяў палескага касцюма было вылучана чатыры яго комплексы: заходнепалескі, пінскі, давыд-гарадоцкі і ўсходні (мазырскі).

Асобная ўвага палескаму касцюму адведзена ў працах вядомага беларускага мастацтвазнаўцы і этнолага М. Ф. Раманюка. За перыяд 1967–1975 гг. ён сабраў багаты матэрыял, прысвечаны касцюму Палесся. Гэтыя звесткі былі пакладзены ў аснову яго дысертацыі «Народны касцюм Беларускага Палесся (канец XIX – пачатак XX ст.)» (1975). Даследчык сістэматызаваў і правёў класіфікацыю каля пяці тысяч прыкладаў традыцыйнага сялянскага касцюма Беларускага Палесся канца XIX – пачатку XX ст., ім былі выяўлены яго канструктыўныя, кампазіцыйныя і дэкаратыўныя асаблівасці, раскрыта функцыянальная ўзаемасувязь складовых частак, іх месца ў абрадавай дзейнасці палешукоў, звернута ўвага на сувязі мясцовага касцюма з касцюмам рускіх, украінцаў, палякаў, літоўцаў. М. Ф. Раманюк вылучыў чатыры тыпы заходнепалескага касцюма: дамачоўскі, маларыцкі, кобрынскі і пінскі. У альбоме «Беларускае народнае адзенне» (1981) даследчык прывёў дапрацаваную класіфікацыю заходнепалескага касцюмнага комплексу, які прадстаўлены пяццю лакальнымі тыпамі (кобрынскі, мотальскі, дамачоўскі, маларыцкі, пінска-івацэвіцкі).

У 1970–1980-я гг. Заходняе Палессе не менш прадуктыўна даследавалася айчыннымі этнолагамі ў рамках збору матэрыялаў і падрыхтоўкі спецыяльных работ, прысвечаных асобным промыслам і рамёствам беларусаў другой паловы XIX – пачатку XX ст. Так, вывучэнне традыцыйнай рыбалоўнай тэхнікі, праведзенае І. М. Браімам, паказала, што большасць прыстасаванняў і спосабаў лоўлі рыбы вядомыя на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Іх асаблівасці выяўляюцца ў характары бытавання, у канструкцыі рыбалоўных прыстасаванняў, у спосабах іх выкарыстання, назвах. На гэтай падставе І. М. Браім вызначыў, што найбольшай своеасаблівасцю адрозніваецца рыбалоўная тэхніка паўночнай (Віцебская, паўночна-заходняя частка Мінскай вобласці) і паўднёва-заходняй (Брэсцкая, поўдзень Гродзенскай, захад Гомельскай і поўдзень Мінскай абласцей) Беларусі [2, с. 88]. Акрамя таго, у выніку выбарачнага абследавання традыцыйнай рыбалоўнай тэхнікі таксама вылучаны некаторыя адрозненні ў прыладах Заходняга і Усходняга Палесся.

У аснову працы А. М. Курыловіч «Белорусское народное ткачество» (1981) пакладзены экспедыцыйныя матэрыялы, сабраныя аўтарам у 1970-х гг., у тым ліку на тэрыторыі Заходняга Палесся. Іх збор ажыццяўляўся па спецыяльна распрацаванай праграме, якая ўключае пытанні па апрацоўцы сыравіны, прадзення, прылад ткацтва, тэхніцы вырабу тканін, іх арнаментацыі. Аўтар паказала шэраг асаблівасцяў дадзенага

занятку ў паўднёва-заходніх раёнах Беларусі, прывяла доказы на карысць неабходнасці выдзялення Палесся ў асобны рэгіён у сувязі з распаўсюджанай тут тэхнікай вырабу і арнаментацыі тканін, правяла паралелі паміж мясцовым ткацтвам і ткацтвам украінцаў [5, с. 72].

Па комплексе прыкмет беларускай народнай керамікі XIX – пачатку XX ст. С. А. Мілючэнкавым на тэрыторыі Беларусі разам з падняпроўскім (усходнім) і паўночна-заходнім (Падзвінне і Панямонне) быў вылучаны і паўднёвы (палескі) рэгіён. У працы «Белорусское народное гончарство» (1984) яму нададзена асобная ўвага. На аснове аналізу розных ганчарных тэхналогій і спецыялізаваных прылад, асаблівасцяў керамічных вырабаў С. А. Мілючэнкаў выявіў шэраг агульных і лакальных рыс беларускага ганчарства. У прыватнасці, некаторыя такія асаблівасці былі зафіксаваны даследчыкам у дачыненні да палескага рэгіёна: «Характерной особенностью в зоне Припятского Полесья было преобладание белоглиняной керамики, изготовление печных горшков с ушками. Аналогичные сосуды делали и на юго-западе Беларуси, в основном в Западном Полесье. Но для этой зоны типичной была чернолощеная керамика» [7, с. 140].

Шэраг рэгіянальных асаблівасцяў пчалярства на Палессі раскрываецца ў сумеснай працы У. С. Гуркова і С. Ф. Цярохіна «Занятие издревле благородное» (1987). Характарызуючы эвалюцыю дадзенага занятку ад старажытнасці да XX ст., аўтары вызначылі, што ён меў сваю спецыфіку ў палескім рэгіёне: «Оазисы бортничества на Полесье потеряли своё хозяйственное значение как в территориальном, так и в количественном исчислении только в начале XIX века. В отличие от остальных историко-этнографических регионов Беларуси, здесь оно было вытеснено не столько антропогенным воздействием на природу, сколько постепенным, продолжавшимся несколько веков распространением колодного пчеловодства» [4, с. 38]. У кнізе таксама паказаны некаторыя асаблівасці бортніцтва і адпаведнай тэхнікі на Палессі, адзначаны шэраг мясцовай спецыфічнай тэрміналогіі ў дачыненні да бортных прылад працы, ахарактарызавана калоднае пчалярства і спадарожныя яму прадметы.

У сваіх даследаваннях промыслаў і рамёстваў беларусаў канца XVIII – XIX ст. да палескіх матэрыялаў звярталася Н. І. Буракоўская [3]. Так, прадстаўляючы разгорнутую тыпалагічную характарыстыку лесахімічнай вытворчасці і прасочваючы дынаміку яе развіцця, даследчыца вызначыла, што на тэрыторыі Беларусі можна вылучыць два рэгіёны з найбольшым узроўнем іх распаўсюджвання – Падняпроўе і Палессе.

Калгасная палітыка, падзеі Вялікай Айчыннай вайны, пасляваенныя аграрныя рэформы актуалізавалі праблему захавання аўтэнтычных аб’ектаў матэрыяльнай культуры беларусаў. У сувязі з гэтым урадам БССР у 1976 г. была прынята пастанова аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Пачалася распрацоўка метадычных асноў яго функцыянавання. Асаблівая ўвага пры гэтым была звернута на гістарычна-этнаграфічнае раянаванне Беларусі, выяўленне асаблівасцяў матэрыяльнай культуры кожнага з рэгіёнаў, а таксама збор рэчыўных аб’ектаў для экспазіцыі музея. В. С. Цітовым на падставе цэлага комплексу крытэрыяў (прыродна-геаграфічныя асаблівасці, мясцовая тапаніміка, моўныя адрозненні, спецыфіка арганізацыі жылога асяроддзя, касцюма) быў навукова абгрунтаваны падзел Беларусі на шэсць гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў (Падзвінне, Падняпроўе, Панямонне, Цэнтральная Беларусь, Заходняе і Усходняе Палессе). У сваёй працы «Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов» (1983) В. С. Цітоў пазначыў межы Заходняга Палесся, раскрыў своеасаблівасць мясцовай культуры, адзначыў шэраг лакальных адрозненняў у прыродна-геаграфічных характарыстыках і матэрыяльнай культуры Заходняга Палесся, на падставе чаго ім было выдзелена тры арэалы: Пабужжа (або Падляссе), Загараддзе і Пінскае Палессе. Істотная ўвага была звернута на асаблівасці палескага жылля, касцюма і прылад працы, праведзена іх арэальнае даследаванне і картаграфаванне. На жаль, на сённяшні дзень рэгіён «Заходняе Палессе» не прадстаўлены як самастойны навукова-экспазіцыйны сектар у Беларускім

дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту. Для паўнавартаснай дзейнасці музея відавочна неабходнасць адкрыцця дадзенага сектара ў самы бліжэйшы час.

Рэгіянальныя асаблівасці вясковага жылля на Палессі раскрываюцца ў публікацыях А. І. Лакоткі: «Беларускае народнае дойлідства: сярэдзіна XIX – XX ст.» (1991), «Беларусы. Т. 2. Дойлідства» (1997), «Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце» (Т.4, кн. 1, 2008). Даследчык паказаў спецыфіку мясцовай дваровай забудовы, канструктыўна-планіровачныя рысы і своеасаблівасць інтэр'еру палескага жылля. Асаблівую каштоўнасць уяўляе сабраны навукоўцам фотаматэрыял, схемы і планы, якімі багата ілюстраваны яго манаграфіі. Пад кіраўніцтвам А. І. Лакоткі была арганізавана работа па падрыхтоўцы і публікацыі шматтомнай серыі «Гарады і вёскі Беларусі» – фундаментальнага выдання, у якім паказана гісторыя і сучасны стан сельскіх і гарадскіх паселішчаў нашай краіны. Два асобныя тамы названай серыі прысвечаны населеным пунктам Брэсцкай вобласці. У іх характарызуецца планіроўка і своеасаблівасць сельскай і гарадской забудовы, раскрываюцца лакальныя асаблівасці жылога комплексу, у тым ліку тых населеных пунктаў, якія цяпер перасталі існаваць.

У 1980-я гг. навукоўцы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР і Львоўскага аддзялення Інстытута мастацтвазнаўства, фальклору і этнаграфіі ім. М. Ф. Рыльскага АН УССР вялі сумеснае комплекснае гістарычна-этнаграфічнае вывучэнне Палесся. У яго ўваходзіла даследаванне этнічнай гісторыі, традыцыйнай культуры палешукоў і яе эвалюцыі ў XX ст. Вынікам працы стала выданне першай манаграфіі падобнага роду – «Полесье. Материальная культура» (1988). У яе аснову былі пакладзены этнаграфічныя матэрыялы XIX – першай паловы XX ст., актыўна выкарыстоўваліся дадзеныя, сабраныя беларускімі і ўкраінскімі даследчыкамі падчас этнаграфічных экспедыцый у розных раёнах Палесся. Палявыя матэрыялы далі багатыя і важныя па сваёй навуковай значнасці звесткі, якія ўсебакова характарызуюць культуру насельніцтва Палесся на працягу некалькіх стагоддзяў. У кнізе асвятляецца шэраг пытанняў, якія раскрываюць мясцовую спецыфіку матэрыяльнай культуры: сельскагаспадарчая дзейнасць, промыслы і рамёствы, транспартныя сродкі, жыллё, касцюм, традыцыі харчавання. Агульныя і спецыфічныя палескія рысы з наяўнасцю лакальнай разнастайнасці былі прасочаны ва ўсіх кампанентах традыцыйнай матэрыяльнай культуры насельніцтва дадзенага рэгіёну. На гэтай падставе на тэрыторыі Украінскага і Беларускага Палесся навукоўцы вылучылі тры падрэгіёны, адзін з якіх – заходнепалескі.

У 1990-х гг. былі закладзены асновы сістэмнага даследавання традыцый харчавання беларусаў, іх рэгіянальнай і лакальнай спецыфікі. Вядучая роля ў вывучэнні гэтай часткі матэрыяльнай культуры належыць Т. А. Навагродскаму. Больш за дваццаць пяць гадоў вучоны праводзіць экспедыцыі па Беларусі. За гэты час ён неаднаразова наведваў Заходняе Палессе. Геаграфія яго экспедыцый ахоплівае Брэсцкі, Драгічынскі, Іванаўскі, Камянецкі, Кобрынскі, Маларыцкі, Пінскі, Пружанскі і іншыя раёны Брэсцкай вобласці. Т. А. Навагродскаму не раз даводзілася непасрэдна назіраць за гатаваннем асобных страў інфармантамі, а таксама асабіста ўдзельнічаць у гэтым працэсе. У сваіх працах («Традыцыйная культура харчавання беларусаў», 2000; «Традыцыі народнага харчавання беларусаў у Заходнім Палессі (на матэрыяле палявых этнаграфічных даследванняў)», 2008; «Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX – XX ст.», 2015) Т. А. Навагродскі раскрывае рэгіянальную спецыфіку палескіх страў і напояў, характарызуе тэхналогію іх прыгатавання, звяртае ўвагу на прадметы хатняга ўжытку і посуд, фіксуе мясцовую кулінарную тэрміналогію.

Вынікі комплекснага фальклорна-этнаграфічнага даследавання традыцыйнай культуры беларусаў Заходняга Палесся, праведзенага калектывам супрацоўнікаў лабараторыі традыцыйнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры і даследчыкаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы НАН Беларусі, былі абагульнены і апублікаваны ў чацвёртым томе шматтомнага выдання «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў». Том «Брэсцкае Палессе» (2009) складаецца з дзвюх кніг, у спецыяльных раздзелах якіх

характарызуюцца асобныя рэгіянальныя асаблівасці заходнепалескага касцюма, вылучаюцца яго лакальныя варыянты, раскрываецца мастацкая спецыфіка і каштоўнасць, паказана розніца паміж касцюмам сялян і жыхароў мястэчак, паміж святочным і паўсядзённым касцюмам, разгледжаны змены ў структуры сялянскага касцюма ў канцы XIX – пачатку XX ст., ахарактарызаваны тэхналогія пашыву і канструктыўныя асаблівасці яго асобных элементаў, іх выкарыстанне ў каляндарнай і сямейнай абраднасці.

З апорай на палескія матэрыялы была падрыхтавана шматтомная серыя «Нарысы гісторыі культуры Беларусі», выданне якой пачалося ў 2013 г. Так, у спецыяльных раздзелах трэцяга тома «Культура сяла XIV – пачатку XX ст.» (Кн. 1. Матэрыяльная культура, 2015) характарызуюцца рэгіянальныя асаблівасці традыцыйнага жылля, традыцый харчавання, касцюма, сельскагаспадарчых заняткаў, промыслаў і рамёстваў беларусаў.

Акадэмічныя традыцыі па вывучэнні заходнепалескай матэрыяльнай культуры падтрымліваюць супрацоўнікі вышэйшых навучальных устаноў краіны. Так, кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта рэгулярна арганізоўвае палявыя этнаграфічныя даследаванні ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, у тым ліку на тэрыторыі Заходняга Палесся. У ходзе экспедыцый выконваюцца розныя віды работ: асабістае назіранне, апытанне мясцовых жыхароў, збор этнаграфічных прадметаў, фотафіксацыя вынікаў назірання, апрацоўка сабранага матэрыялу, яго расшыфроўка і набор. Кіраўніком такіх этнаграфічных паездак з'яўляецца загадчык кафедры, доктар гістарычных навук, прафесар Т. А. Навагродскі. Разам з ім працуюць І. С. Махоўская, С. А. Захаркевіч, І. В. Алюніна, І. Г. Бачыла. Трэцяя частка ўсіх палявых экспедыцый – гэта даследаванні на тэрыторыі Заходняга Палесся. Так, у ліпені 2004 і 2007 гг. былі арганізаваны экспедыцыі ў Пружанскім і Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці адпаведна. Збор палявога матэрыялу па традыцыйнай культуры насельніцтва Беларускага Палесся ажыццяўляўся летам 2009 г. у вёсцы Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Вынікам дадзенага даследавання стала праца «Народная кухня маталян». Экспедыцыя летам 2010 г. праходзіла таксама на тэрыторыі Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці – у вёсцы Тышкавічы.

Знакавай стала летняя экспедыцыя 2017 г. Яна праходзіла на Лунінеччыне – пераходнай зоне паміж дзвюма гістарычна-этнаграфічнымі абласцямі – Заходнім і Усходнім Палессем. Палявыя даследаванні былі прысвечаны стогадоваму юбілею вывучэння вічынскіх палян вядомым беларускім этнографам І. А. Сербавым. Матэрыялы па зменах традыцыйнай культуры мясцовых жыхароў збіраліся ў вёсках Вічын, Дварэц, Дрэбск, Яжаўкі, Язвінкі, Сасноўка, Кажан-Гарадок. Услед за І. А. Сербавым удзельнікі экспедыцыі на працягу трох тыдняў даследавалі мясцовыя асаблівасці планіроўкі паселішчаў, жыллё, заняткі, традыцыі харчавання. Сабраныя матэрыялы падрыхтаваны да друку.

Такім чынам, айчынная этналогія другой паловы XX ст. унесла істотны ўклад у вывучэнне традыцыйнай матэрыяльнай культуры Заходняга Палесся. Рэгіён дастаткова ўважліва і паглыблена даследаваўся падчас падрыхтоўкі гістарычна-этнаграфічнага атласа, пры вывучэнні жылля, касцюма, традыцый харчавання, промыслаў і рамёстваў беларусаў. Апошнія дзесяцігоддзі па-ранейшаму дэманструюць вялікую цікавасць да Заходняга Палесся з боку спецыялістаў у галіне айчыннай этналагічнай навукі. Матэрыялы аб рэгіёне кладуцца ў аснову самых разнастайных па сваёй тэматыцы публікацый. Да ліку такіх прац варта аднесці публікацыі В. М. Бялявінай (традыцыі земляробства), Г. І. Каспяровіч (традыцыі жывёлагадоўлі), С. А. Захаркевіча (транспартныя сродкі), М. А. Міхайлеца (сельскагаспадарчыя заняткі), С. А. Сергачова (народнае дойлідства), В. А. Лабачэўскай (касцюм), А. М. Раманюк (касцюм) і інш.

Адной з акутальных задач для беларускіх этнолагаў у XXI ст. стала выяўленне этнакультурных асаблівасцяў рэгіёнаў Беларусі і падрыхтоўка першых абагульняючых выданняў па кожным з іх. Калектывам навукоўцаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ўжо шмат

гадоў вядзецца праца па падрыхтоўцы серыі «Этнакультурныя працэсы ў мінулым і сучаснасці», накіраванай на захаванне і развіццё ўсёй разнастайнасці культурных традыцый беларускага этнасу. Чатыры кнігі з шасці запланаваных ужо надрукаваны. Лагічным працягам гэтай серыі стане кніга, прысвечаная Заходняму Палессю. Выхад апошняй плануецца ў самы бліжэйшы час.

**Библиографические ссылки:**


1. Беларускае народнае адзенне / Акадэмія навук БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 94 с.
2. Браім, I. М. Рыбалоўства ў Беларусі (гісторыка-этнаграфічны нарыс) / рэд. М. Я. Грынблат. Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 136 с.
3. Буракоўская, Н. І. Традыцыйныя лесахімічныя промыслы Беларускага Палесся / Н. І. Буракоўская // Быт і культура беларусаў : тэзісы дакладаў навук. канф. «Быт і культура беларусаў», Мінск, красавік 1984 г. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. Мінск, 1984. – С. 28–29.
4. Гурков, В. С., Терехин, С. Ф. Занятие издревле благородное / В. С. Гурков, С. Ф. Терехин. Минск : Полымя, 1987. – 136 с.
5. Курилович, А. Н. Белорусское народное ткачество / А. Н. Курилович. – Минск : Наука и техника, 1981. – 119 с.
6. Материальная культура белорусов / Л. А. Молчанова. – Минск : Наука и техника, 1968. – 230 с.
7. Милюченков, С. А. Белорусское народное гончарство / С. А. Милюченков. Минск : Наука и техника, 1984. – 183 с.


УДК 321(476)"19"(06)+327(476)(06)

## НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВОЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ МУЗЕЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

**Л.У. Бярэйшык**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр.Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; Bereischik@bsu.by*

У артыкуле разглядаецца сучасны этап развіцця нарматыўна-прававой базы па рэгуляванню сферы музейнай дзейнасці згодна прынятаму і ўступіўшаму ў сілу ў 2017 г. Кодэксу аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь.

***Ключавыя словы:*** музейнае заканадаўства; нарматыўна-прававое забеспячэнне музейнай дзейнасці; гісторыка-культурная спадчына; дзяржаўнае рэгуляванне.

## НОРМАТИВНО-ПРАВОВОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ МУЗЕЙНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ

**Л.В. Берейшик**

*Белорусский государственный университет,*
*пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь; Bereischik@bsu.by*

В статье рассматривается современный этап развития нормативной правовой базы по регулированию сферы музейной деятельности согласно принятому и вступившему в силу в 2017 г. Кодексу о культуре Республики Беларусь.

***Ключевые слова:*** музейное законодательство; нормативно-правовое обеспечение музейной деятельности; историко-культурное наследие; государственное регулирование.

## THE PRESENT DAY LEGISLATION OF MUSEUM ACTIVITY

**L.V. Bereishik**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus; Bereischik@bsu.by*

The article reviews the present day legislation of museum activity based on the Code of Culture of the Republic of Belarus issued in 2017.

***Key words:*** museum legislation; standard legal support of museum activities; historical and cultural heritage; official regulation.